***Маўленчая размінка.*** Прачытайце ўрывак з верша Міхася Сазончыка «Сонца мыецца», захоўваючы правільнае вымаўленне гукаў [р], [дз’], [г], [ў].

Над зямлёю соннай
Зазвінелі жаўрукі,
Разбудзілі сонца
Тут, на беразе ракі.

Ветрык вее ледзьве.
Неба чыстае, без хмар.
Я падгледзела, як мые
Сонца ў рэчцы твар.

**Успомніце.** Ці даводзілася вам назіраць за ўсходам сонца? Калі і дзе вы бачылі гэту з’яву прыроды? Якія ўражанні атрымалі ад яе?

**Зычлі́вы** — які жадае дабра другому.
**Чырво́нец** — *тут*: манеты, золата, грошы.
**Ша́ты** — *тут*: цені.

## Усход сонца

*Якуб Колас*



На ўсходзе неба грае
Пераліўным блескам,
Сыпле золата над гаем
І над пералескам.

Чуць-чуць дрогне, праліецца
Чырвань на ўсходзе —
Гэта неба ўсміхнецца
Людзям і прыродзе.



Правообладатель Академия образования



Смех адказны, смех шчаслівы
Ходзіць па пагорках.
Час світання — час зычлівы...
Гаснуць, нікнуць зоркі.

Шы́рай, шырай зараніца
Разнімае крылле,
Нібы пожар б’е крыніцай
Там, на небасхіле.

Сноп праменняў, пышна ўзняты,
Сее бляск-чырвонцы —
Гэта неба сцеле шаты
На дарогу сонцу.

?

1. Якія пачуцці перадаюцца ў вершы?
2. Якія малюнкі вы ўяўлялі, калі чыталі твор?
3. Пры дапамозе якіх вобразных слоў перадаецца прыгажосць усходу сонца?
4. Як вы лічыце, што зменіцца ў змесце і настроі верша, калі ў выразе *чырвань дрогне* замест слова *дрогне* ўжыць слова *блісне*?
5. Адшукайце радкі, дзе адзін прадмет (з’ява) параўноўваецца з іншым. Паспрабуйце абгрунтаваць, для чаго аўтар выкарыстоўвае гэты прыём.
6. Падумайце, з якой інтанацыяй, у якім тэмпе трэба чытаць верш.
7. Разгледзьце ілюстрацыю да твора. Якія карціны вы маглі б намаляваць да гэтага верша? Апішыце іх.
8. Вывучыце верш на памяць.

## *У свеце прыгожага*

1. Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны Архіпа Куі́нджы «Дняпро раніцай».



2. Адкажыце на пытанні.

1) З дапамогай чаго перадаецца мастаком прыгажосць раніцы?

2) Які настрой стварае пейзажыст?

3) Якія радкі з верша Якуба Коласа «Усход сонца» падыходзяць да карціны мастака? Прачытайце іх.

4) Уявіце, што мастаком гэтай карціны з'яўляецеся вы. Як назвалі б гэтую работу? Чаму?

**Творчае заданне.** Паспрабуйце на наступны ўрок па сваім жаданні зрабіць самастойна ілюстрацыю да верша Якуба Коласа «Усход сонца». Выкарыстайце рэкамендацыі памяткі «Як выканаць ілюстрацыю да прачытанага літаратурнага твора» (форзац 1).



Правообладатель Академия образования

**По́плаў** — звычайна заліўны луг.
**Ралля́** — узаранае поле, глеба.
**Умало́тны** — *тут*: багаты на ўраджай.



## Жнівень

*Віктар Гардзей*

Год багаты, умалотны.
Пахне жытам і раллёй.
Жнівень белыя палотны
Рассцілае над зямлёй.

У тумане на балоце
Пратрубілі журавы.
Гай стаіць у пазалоце,
Парыжэлі паплавы.

Над лясамі, над лугамі
Праплыве гусіны клін.
Не змываецца дажджамі
Чырвань яркая з калін.

На хмурынцы гром паехаў
Міма сосен і дубоў.
Многа яблык і арэхаў,
Многа ягад і грыбоў.

Пазбіраюць людзі дбайна
Лета шчодрыя дары.
Сціхлі на палях камбайны —
Загудзелі трактары.



За асінкай, за вярбою
Восень — рыжаю лісой.
Пахне жытам і раллёю
Перад новаю сяўбой.



1. Па якіх прыкметах можна сцвярджаць, што паэт апісвае жнівень? Прывядзіце ў доказ адпаведныя радкі з верша.
2. Апішыце словамі карціны, якія ўзніклі ў вашым уяўленні падчас чытання верша.
3. Адшукайце ў творы і прачытайце радкі, у якіх прадмет ці з’ява параўноўваюцца з іншымі прадметамі.
4. Якія дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні, ажыўляюць жнівеньскую прыроду? Знайдзіце іх.
5. Уважліва разгледзьце фотаздымкі да верша. З якімі радкамі з твора яны сугучны? Знайдзіце і прачытайце іх.
6. Падумайце, з якім настроем і інтанацыяй патрэбна чытаць гэты верш. Якія словы трэба вылучыць голасам? Дзе зрабіць паўзы? Прачытайце верш выразна.



Народнае свята «Дажы́нкі» ў старажытнасці прысвячалася заканчэнню жніва.

Зараз свята «Дажынкі» адзначаюць як свята ўраджаю. У кожным раёне і вобласці нашай Радзімы ўзнагароджваюць хлебаробаў за іх нялёгкую працу. Найлепшых аграрыяў краіны ў пачатку студзеня кожнага года ўрачыста ўшаноўваюць у Палацы Незалежнасці ў Мінску.



Правообладатель Академия образования

**Успомніце.** У папярэдніх класах вы ўжо знаёміліся з вершамі і апавяданнямі на тэму восені. Успомніце іх назвы і аўтараў. Асобныя вершы прачытайце на памяць.

Ці даводзілася вам назіраць такую прыродную з'яву, як бабіна лета? Якія прыкметы гэтай з'явы адлюстраваны на карціне Алены Бархатковай «Бабіна лета»?



**За́пар** — непасрэдна адзін за адным, без пропуску.
**Быльнёг** — рознае буйнасцяблавае пустазелле.
**Кузу́рка** — усякае маленькае, дробнае насякомае.